# *Памяці таварыша*

## МІХАІЛ ІОСІФАВІЧ СЫРАКВАШ



16 кастрычніка 1989 года раптоўна памёр Міхаіл Іосіфавіч Сыракваш — адзін з вядомых выкладчыкаў беларускай мовы Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

М. І. Сыракваш нарадзіўся 5 снежня 1930 года ў вёсцы Капачы Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы ён паступіў на філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, які паспяхова закончыў у 1954 годзе. У час вучобы ва універсітэце прымаў актыўны ўдзел у навукова-даследчай і грамадскай дзейнасці. Свой працоўны шлях пачаў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры Будслаўскай сярэдняй школы Мядзельскага раёна, а затым быў прызначаны дырэктарам Мільчанскай сярэдняй школы гэтага ж раёна. Ужо тады малады і дапытлівы педагог звярнуў на сябе ўвагу як у раёне, так і на філалагічным факультэце. З восені 1957 года М. І. Сыракваш — аспірант кафедры беларускай мовы БДУ імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння аспірантуры ён амаль 30 год выкладаў ва універсітэце беларускую мову.

Вучэбна-выхаваўчую работу М. І. Сыракваш паспяхова спалучаў з навукова-даследчай. У цэнтры яго навуковых інтарэсаў былі пытанні сінаніміі ў беларускай мове. У работах «Да пытання сінаніміі ў беларускай мове», «Праблемы сінаніміі ў айчынным мовазнаўстве», «Аб вылучэнні дамінанты ў сінанімічным радзе», «Вывучэнне сінонімаў на практычных занятках у курсе сучаснай літаратурнай мовы» ён адным з першых у беларускім мовазнаўстве звярнуў увагу на неабходнасць падрыхтоўкі слоўнікаў сінонімаў, абгрунтаваў прымяненне прынцыпаў частковай або поўнай узаемазамяняемасці сінонімаў, падтрымаў думку аб абавязковасці ўключэння ў сінанімічны рад фразеалагічных спалучэнняў. Гэтыя і іншыя навуковыя работы М. І. Сыракваша далі пэўны штуршок паглыбленаму вывучэнню праблем сінаніміі ў беларускай мове.

М. І. Сыракваш заслужана карыстаўся аўтарытэтам шматлікіх пакаленняў студэнтаў філалагічнага факультэта і факультэта журналістыкі. На занятках па беларускай мове ён удала спалучаў традыцыйныя і навейшыя метады навучання, умеў зацікавіць прадметам выкладання. Шмат увагі ўдзяляў прафарыентацыі школьнай моладзі, з лекцыямі і гутаркамі пра філфак і універсітэт выступаў у розных кутках Беларусі. На працягу многіх гадоў быў куратарам студэнцкіх груп, неаднаразова выбіраўся ў склад партыйнага бюро факультэта, розных грамадскіх арганізацый.

У асобе М. І. Сыракваша гарманічна спалучаліся спагадлівасць і чуласць да людзей, прынцыповасць і партыйнасць у вырашэнні праблем вучэбнага і выхаваўчага працэсу, з выключнай павагай ставіўся ён да асобы студэнта і выкладчыка. Яго добра ведалі не толькі як філолага, адданага роднаму слову, але і як сціплага і сардэчнага чалавека, дарадцу і цікавага субяседніка па розных пытаннях беларускай навукі і культуры.

Светлая памяць аб Міхаіле Іосіфавічу Сыракваша назаўсёды захаваецца ў сэрцах тых, хто яго ведаў, хто з ім працаваў, каго ён вучыў.

**Кафедра беларускай мовы**